# Дапамогі на дзяцей да 3 гадоў будуць пераглядацца двойчы за год

**Дзяржаўныя дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей да 3 гадоў, будуць пералічвацца двойчы ў год — з 1 лютага і з 1 жніўня. Калі сярэднямесячная зарплата работнікаў краіны, з якой вызначаецца памер дапамогі па доглядзе дзіцяці да трох гадоў, паменшыцца, дадзеная дапамога будзе назначацца і выплачвацца ў памеры, які быў вылічаны да змяншэння зарплаты.**

Акрамя таго, сем'і з непаўналетнімі дзецьмі, у якіх бацькі з'яўляюцца інвалідамі першай або другой групы, а таксама сем'і, дзе адзін з бацькоў — інвалід першай групы, а другі ажыццяўляе яго догляд, будуць атрымліваць дапамогу на дзяцей старэйшых за тры гады да дасягнення імі 18 гадоў без уліку факта іх навучання ва ўстановах адукацыі на бясплатнай аснове.

Таксама бацькі, усынавіцелі або апекуны дзяцей-інвалідаў будуць атрымліваць дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда ад 3 да 18 гадоў і ў тым выпадку, калі яны будуць працаваць няпоўны дзень або выконваць працу дома. Гэта дазволіць бацькам дзяцей-інвалідаў павысіць узровень даходу сям'і і выпрацаваць страхавы стаж для прызначэння працоўнай пенсіі. Дадзеныя асобы будуць мець права на гэтую дапамогу і ў выпадку атрымання імі пенсіі альбо штомесячнай страхавой выплаты.

Будзе павялічаны памер дапамогі па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў — на дзіця з трэцяй або чацвёртай ступенню страты здароўя. Пасля таго як яму споўніцца тры гады, гэта дапамога павялічыцца са 100% да 120% ад бюджэту пражыткова мінімуму.

Права на дапамогу атрымаюць і цяжарныя жанчыны, якія сталі на ўлік да 12-тыднёвага тэрміну не толькі ў дзяржаўных, але і ў прыватных клініках.

Людзі, якія выхоўваюць дзяцей, будуць мець роўныя магчымасці па атрыманні сацыяльных дапамог незалежна ад іх рэгістрацыйнага ўліку, г. зн. не толькі па месцы пражывання, але і па месцы часовага знаходжання.

Большасць змен уступіць у сілу ўжо з 1 ліпеня. Змены, звязаныя з пераразлікам памеру дзіцячых дапамог, уступяць у сілу з 1 жніўня.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

**Папраўкі ў некаторыя законы па пытаннях дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, былі прынятыя дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў на пасяджэнні ў другім чытанні.**

■ Падзея

# ЖЫМ ПЛЮС ЦЯГА

**Чэмпіянат свету па паўэрліфтынгу стартуе сёння ў Мінску**

**З 15 па 17 чэрвеня пройдзе турнір для ветэранаў, затым спаборніцтвы працягнуць юнакі і юніёры, а з 21-га па 25 чэрвеня на памостах выступяць прафесіяналы. Чэмпіянат прымае сталічны Палац спорту, спаборніцкая праграма штодня пачынаецца з 10 раніцы.**



Удзел у турніры возьмуць амаль 900 спартсменаў з 52 краін, у Мінск прыедуць наймацнейшыя зборныя — з ЗША, Украіны, Расіі, Канады. Звычайна атлеты менавіта з гэтых краін збіраюць самы багаты ўраджай узнагарод на аналагічных турнірах. Беларускую зборную прадстаўляць 15 атлетаў. Найбольшыя надзеі ў гэтым відзе спорту сёлета ў нас звязваюць з сусветным рэкардсменам сярод моладзі па жыме лежачы Уладзіславам Папельскім, чэмпіёнкай свету 2016 года ў катэгорыі да 47 кг Таццянай Дамашынай, а таксама сярэбраным прызёрам чэмпіянату Еўропы гэтага года Сняжанай Зубко. На жаль, атрымаў траўму і не зможа прыняць удзел у гэтых спаборніцтвах заслужаны майстар спорту краіны па паўэрліфтынгу Аляксандр Грынкевіч-Суднік, у яго актыве ўжо ёсць чатыры перамогі на чэмпіянатах свету. У Мінску Аляксандр выступіць у якасці трэнера.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by* ■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ДЗЕ ДАВЕДАЦЦА ПРА ПЕНСІІ?

**Запрацаваў Нацыянальны інтэрнэт-партал сацыяльнай абароны**

**Сайт запусцілі, каб павысіць эфектыўнасць узаемадзеяння органаў і арганізацый сацыяльнай абароны з насельніцтвам. Тут можна знайсці інфармацыю пра пенсіі, дапамогі, іншыя выплаты і скарыстацца электроннымі паслугамі і сэрвісамі, звязанымі з сацыяльна-працоўнай сферай.**

Так, на партале расказваецца пра паслугі і адміністрацыйныя працэдуры, парадак і ўмовы іх атрымання, асвятляюцца прававыя і арганізацыйныя пытанні дзейнасці органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. На сайце можна вылічыць прыкладны памер сваёй пенсіі, падаць электронны зварот і запісацца на прыём да спецыялістаў сферы, з дапамогай электроннага лічбавага подпісу заказаць шэраг паслуг, у тым ліку атрымаць пра сябе інфармацыю, зарэгістраваную ў Дзяржаўнай інфармацыйнай сістэме сацыяльнай абароны.

Пакуль што партал працуе ў тэставым рэжыме.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

## ВАЙНА НАГАДВАЕ ПРА СЯБЕ

У вёску Збураж Маларыцкага раёна сапёры прыбылі па выкліку з міліцыі. А ў міліцыю пазваніў мясцовы жыхар. Ён перакопваў уласны агарод і, нібы бульбу, даставаў адзін за адным жалезныя прадметы. Імі аказаліся мінамётныя міны часоў вайны. Спецыялісты сапёрна-піратэхнічнай групы вывезлі з агарода фермера 48 мін калібру 81 міліметр і знішчылі іх на палігоне, паведамілі ў Брэсцкім абласным упраўленні ўнутраных спраў.

А днём раней на тэрыторыі Баранавіцкай абутковай фабрыкі рабочы пры правядзенні земляных работ знайшоў боепрыпас. Гэтым разам давялося эвакуяваць больш за сто чалавек — супрацоўнікаў фабрыкі. Спецыялісты вывезлі з двара прадпрыемства снарад часоў Вялікай Айчыннай вайны і знішчылі небяспечны груз.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

## БРАКАНЬЕРА З ВОСТРАВА БРАЛІ З АМАПам

**У затрыманага — «букет» злачынстваў**

**Парушальніка, які займаўся незаконным рыбалоўствам, затрымалі на Светлагорскім вадасховішчы. Бралі яго ў тым ліку і байцы АМАПа, бо гэты персанаж мае багатую крымінальную біяграфію...**

50-гадовы мужчына, грамадзянін Расіі, што пражываў на тэрыторыі Беларусі, у мінулым неаднаразова прыцягваўся да адказнасці за розныя злачынствы — рабаванне, крадзеж, забойства. За што летась быў дэпартаваны і ўезд у нашу краіну яму быў забаронены на тры гады. Аднак грамадзянін тайком вярнуўся і асталяваўся на адным з астравоў Светлагорскага вадасховішча. Была інфармацыя, што ён лавіў рыбу сеткамі, апроч таго, абзавёўся абрэзам.

— На затрыманне выехалі 11 дзяржінспектараў са Светлагорска і тры супрацоўнікі гомельскага АМАПа. Раздзяліўшыся на групы, яны патрулявалі вадаём двое сутак. Падазраванага затрымалі, калі ён накіроўваўся ў бліжэйшую вёску са сваім незаконным уловам, здабытым пры дапамозе сетак і восцяў. Незаконныя прылады лоўлі потым знайшлі на востраве, як і зараджаны абрэз, — расказалі ў Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і раслінная свету. — Мужчыну пагражае адказнасць адразу па трох крымінальных артыкулах — за незаконнае рыбалоўства, незаконныя дзеянні ў адносінах да агнястрэльнай зброі і нелегальнае перасячэнне граніцы Беларусі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ЦЫЛІНДРЫ З ПЕРАВЫШЭННЕМ РАДЫЯЦЫЙНАГА ФОНУ

**Ранкам у МНС паступіла паведамленне пра перавышэнне ўзроўню натуральнага радыяцыйнага фону пры правядзенні радыяцыйнага кантролю чыгуначнага вагона, гружанага дробленым металаломам, на тэрыторыі ААТ «Белдругчармет» у Гатаве.**

Высветлілася, што пры праходжанні праз стацыянарную ўстаноўку радыяцыйнага кантролю чыгуначнага вагона зафіксавана перавышэнне ўзроўню натуральнага радыяцыйнага фону ў 17 разоў, на адлегласці аднаго метра радыяцыйны фон быў у норме.

Ратавальнікамі Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС металалом быў выгружаны на адкрытую пляцоўку. Пры дапамозе спектрометраў праводзілася абследаванне грузу з вагона. Быў знойдзены металічны прадмет цыліндрычнай формы (даўжыня 10 см, дыяметр 3 см). Перавышэнне радыяцыйнага фону на яго паверхні было ў 250 разоў. Потым былі выяўлены другі металічны прадмет цыліндрычнай формы (даўжыня 8 см, дыяметр 3 см) з перавышэннем радыяцыйнага фону ў 100 разоў.

Крыніцы іанізуючага выпраменьвання перададзены для ўтылізацыі ва УП «Экарэс». Пацярпелых і пагрозы радыяцыйнага забруджвання навакольнага асяроддзя няма.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*


# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению антикризисного управляющего частного предприятия «Аналитик-центр» в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) проводит открытые аукционы по продаже имущества в составе:

| **Имущество частного унитарного предприятия «Альфа Браво»: Стоимость снижена на 10%** | | | |
|---|---|---|---|
| **№ Лота** | **Наименование объекта, сведения о земельном участке (площадь, кадастровый номер)** | **Начальная цена без НДС, бел. руб.** | **Размер задатка (10 %), бел. руб.** |
| 1 | **Здание столярной мастерской** общ. пл. 84,9 кв. м, инв. №630/С-58539, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623883901601000037 площадью 0,4415 га. **Здание арочника** общ. пл. 675,4 кв. м, инв. №630/С-58531, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623883901601000038 площадью 0,3793 га. Навес для хранения готовой продукции, забор (протяженность 233,5 м) Объекты расположены по адресу: Минская область, Молодечненский район, Граничский с/с, д. Горняки | 30 800,09 | 3 080,00 |

Шаг аукциона – 10 (десять) процентов.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение результативного аукциона.**

**Задатки перечисляются на р/с 3012108260016 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;

- для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);

- для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);

- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);

- для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется условиями о проведении торгов, ознакомиться с которым можно в дни приема заявлений на участие в торгах, а также на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 18.05.2017.

Аукцион состоится **30.06.2017 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.06.2017** до **16.00** по указанному адресу.

**Телефоны организатора торгов: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

**Телефоны антикризисного управляющего ЧУП «Аналитик – центр»: (8017) 284 05 66, (8017) 284 05 67, (8029) 670 56 16.**

Утерянные бланки страховых полисов формы 2РН серия КЕн №№0041147–0041149 считать недействительными. УНП 100985903

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «СТРОЙКОМПЛЕКС»

| **Предмет торгов** | | **Начальная цена** | **Размер задатка** |
|---|---|---|---|
| Изолированное помещение (инв. №100/D-128334) – двухкомнатная квартира, пл. 56,6 кв. м, расположенная по адресу: Брестская обл., г. Брест ул. Фомина 12-9 | | 67 355,00 рублей | 1560,00 рублей |
| **Условия продажи** | Без условий | | |
| **Организатор торгов** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | 3012178938017 в ОАО «БПС-Сбербанк», Региональная дирекция №100 по Брестской области, код 369, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, УНП 201028245 | | |

**Аукцион состоится 27 июня 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329, в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**

**Последний день приема заявлений – 26 июня 2017 г. до 17.00**